Весці БДПУ. Серыя 2. 2023. № 2. С. 41–48

УДК 930:[94(476)34“17/19]

# СУДОВАЯ СІСТЭМА НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XVIII – ПАЧАТКУ XX СТ.: ГІСТАРЫЯГРАФІЯ ПРАБЛЕМЫ

**І. Г. Гушчынскі,**
*кандыдат гістарычных навук,*
*дацэнт кафедры агульнай і дашкольнай*
*педагогікі Беларускага дзяржаўнага*
*педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка*

Паступіў у рэдакцыю 22.03.23.

UDC 930:[94(476)34“17/19]

# JUDICIAL SYSTEM IN THE TERRITORY OF BELARUS IN LATE 18th – EARLY 20th CENTURY: HISTORIOGRAPHY OF THE PROBLEM

**I. Hushchynski,**
*PhD in History, Associate Professor*
*of the Department of General and Preschool*
*Pedagogy, Belarusian State Pedagogical*
*University named after Maxim Tank*

Received on 22.03.23.

У артыкуле прадстаўлены аналіз гістарыяграфіі па тэме судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. Паказаны асаблівасці гістарыяграфіі розных перыядаў: Расійскай імперыі, савецкага, постсавецкага. Зроблена выснова аб тым, што, нягледзячы на даволі вялікую колькасць публікацый, тэма судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1917 гг. з’яўляецца перспектыўнай для далейшага вывучэння. Недастаткова раскрытымі і, адпаведна, перспектыўнымі для даследавання бачацца наступныя праблемы: патрэбы грамадскага развіцця як фактар эвалюцыі судовай сістэмы, роля судовых органаў у сацыяльна-эканамічным развіцці, стасункі паміж судовымі ўстановамі і адміністрацыйнай уладай.

*Ключавыя словы*: гістарыяграфія, судовая сістэма, Статут ВКЛ 1588 г., судовая рэформа 1864 г., заходнія губерні.

The article analyzes historiography on the theme of judicial system in the territory of Belarus in late 18th – early 20th century. It shows the features of historiography of different periods: the Russian Empire, Soviet, post-Soviet. It concludes that in spite of quite large number of publications the theme of judicial system in the territory of Belarus in 1772 –1917 is prospective for further studying. The following problems are insufficiently revealed and thus prospective for studying: needs of society development as a factor of judicial system evolution, the role of judicial bodies in social-economic development, relations between judicial institutions and administrative power.

*Keywords:* historiography, judicial system, GDL Statute of 1588, judicial reform of 1864, Western provinces.

*Уводзіны.* Даследаванне гісторыі судовай сістэмы з’яўляецца актуальнай тэмай для гістарычнай і юрыдычнай навукі. Па-першае, яе вывучэнне дае магчымасць у больш поўнай ступені раскрыць і асэнсаваць працэсы, якія адбываліся ў жыцці грамадства ў пэўную эпоху. Па-другое, гэта дазваляе выкарыстоўваць гістарычны вопыт пры правядзенні мерапрыемстваў па ўдасканаленні судаводства і судаўладкавання на сучасным этапе. У сваю чаргу, якаснае гістарычнае даследаванне прадугледжвае правядзенне грунтоўнага аналізу наяўнай гістарыяграфіі па праблеме. Натуральна, гэта датычыць і гісторыі судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў перыяд знаходжання краю ў складзе Расійскай імперыі. Таму мэтай дадзенага артыкула з’яўляецца вызначыць ступень навуковай распрацаванасці праблемы ў гістарычнай навуцы.

Тэма судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў перыяд знаходжання краю ў складзе Расійскай імперыі знайшла адлюстраванне ў даволі вялікай колькасці прац. Іх выхад у свет можна падзяліць на 3 перыяды: 1) Расійскай імперыі; 2) савецкі; 3) постсавецкі. Асобна ў храналагічнай паслядоўнасці аналізуюцца публікацыі замежных аўтараў.

*Асноўная частка.* ***Гістарыяграфія перыяду Расійскай імперыі.*** Большая частка публікацый, па праблеме судовай сістэмы Расійскай імперыі канца XVIII – пачатку XX ст. (у тым ліку на тэрыторыі Беларусі), выдадзеных да 1917 г., насіла практычна-юрыдычны ці публіцыстычны характар. Гэта натуральным чынам абумоўлена тым, што ў большасці з іх разглядалася дзеючая судовая сістэма, сведкамі якой з’яўляліся даследчыкі. Была выдадзена вялікая колькасць даведнікаў, падручнікаў, лекцыйных курсаў па праве і судаводстве. У спецыялізаваных юрыдычных перыядычных выданнях раскрываліся актуальныя пытанні прымянення заканадаўства, апісвалася практычная дзейнасць судовых органаў. Многія аўтары ў сваіх публікацыях імкнуліся абгрунтаваць сваю пазіцыю адносна тых ці іншых праблем правасуддзя, што надавала ім яскрава выяўлены публіцыстычны характар. Уласна гістарычныя даследаванні пачалі выдавацца з другой паловы XIX ст. Большая іх частка прысвечана перыяду канца XVIII – першай паловы XIX ст. або правядзенню судовай рэформы 1864 г. Многія іх аўтары самі на практыцы мелі дачыненне да разглядаемых праблем у якасці чыноўнікаў ці адвакатаў, што дазволіла ім узмацніць фактaлагічную базу сваіх прац. Аднак з іншага боку, у дарэвалюцыйны перыяд для даследчыкаў былі практычна недаступны архіўныя дакументы дзеючых дзяржаўных устаноў.

Прац, у якіх раскрываліся праблемы судаводства і судаўладкавання менавіта на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1917 гг., у дарэвалюцыйны пе-

рыяд выйшла адносна няшмат. У наяўных публікацыях найбольшая ўвага была нададзена развіццю судовай сістэмы ў краі ад моманту яго ўключэння ў склад Расійскай імперыі да 1840 г., калі Мікалаем І быў завершаны перавод дадзенай тэрыторыі на расійскія парадкі ў сферы суда. У гэты час судова-прававы лад у краі істотна адрозніваўся ад агульнаімперскага. Гэта патрабавала наяўнасці адпаведнай спецыялізаванай дапаможнай юрыдычнай літаратуры. Да такіх выданняў можна аднесці «Ручной словарь, или краткое содержание польских и литовских законов» [1], а таксама працы вядомага правазнаўцы таго часу А. Каравіцкага [2; 3].

Шэраг гістарычных і гісторыка-прававых даследаванняў, якія былі цалкам ці часткова прысвечаны розным аспектам судаводства і судаўладкавання ў заходніх губернях у перыяд захавання тут дзеяння Статута ВКЛ 1588 г. (г. зн. да 1840 г.), з'явіўся ў другой палове XIX – пачатку XX ст. [4; 5; 6, с. 425–433]. Найбольшай увагі з іх у кантэксце вывучаемай тэмы заслугоўваюць працы М. П. Жуковіча [4; 5]. У іх даволі падрабязна раскрываецца палітыка расійскага ўрада ў перыяды праўлення Кацярыны ІІ і Паўла І адносна сферы правасуддзя на тэрыторыі, далучанай у выніку падзелаў Рэчы Паспалітай. Сярод іншага М. П. Жуковіч станоўча ацаніў распаўсюджанне ў 1778 г. Кацярынай ІІ «Учреждений для управления губерниями Всероссийской империи» (далей – «Учреждений…») ад 7 лістапада 1775 г. на тэрыторыю тагачасных Полацкай і Магілёўскай губерняў. На яго думку, гэта стварыла тут стройную сістэму мясцовага суда, абасобленага ад адміністрацыі, блізкага да ўсіх саслоўных груп, з перавагай у яго складзе выбарнага пачатку [4, с. 110].

Пасля таго як у 1840 г. Мікалай І скасаваў дзеянне ІІІ Статута ВКЛ у Мінскай, Гродзенскай і Віленскай губернях, быў завершаны перавод заходніх губерняў на судовую сістэму расійскага ўзору. Адсутнасць спецыфікі не стварала нагоду для даследчыкаў спецыяльна разглядаць праблему правасуддзя менавіта ў дадзеным рэгіёне. Што датычыць расійскай агульнаімперскай судовай сістэмы, якая дзейнічала на тэрыторыі Беларусі ў поўным аб'ёме з 1840 г., то ёй прысвечана даволі шмат прац. Большасць з іх – спецыялізаваныя юрыдычныя публікацыі навуковага, вучэбнага, даведачнага характару, выдадзеныя да 1864 г.

У 1864 г. у Расійскай імперыі пачалося правядзенне карэннай судовай рэформы. У дарэвалюцыйны перыяд выйшла велізарная колькасць прац, прысвечаных непасрэдна ёй, а таксама розным аспектам парэформеннага судаводства і судаўладкавання. У цэлым, панавала пазітыўная ацэнка рэформы. Большасць аўтараў былі прафесійнымі юрыстамі (Г. А. Джаншыеў [7], А. Ф. Коні [8] і інш.). Для іх было відавочна, што ўведзеныя рэформай ліберальна-дэмакратычныя прынцыпы судаводства і судаўладкавання (абасабленне суда ад адміністрацыйнай улады, усесаслоўнасць, галоснасць і спаборнасць судовага працэсу, выбарнасць міравых суддзяў, суд прысяжных) адпавядалі задачам эфектыўнага і справядлівага правасуддзя, фарміравання даверу да яго з боку насельніцтва. Напрыклад, Г. А. Джаншыеў у сваёй працы «Эпоха великих реформ. Исторические справки» падкрэсліваў, што без рэалізацыі прынцыпаў галоснасці, незалежнасці суда, суда прысяжных развіццё правасуддзя немагчыма, «как невозможно здоровье организма без чистого воздуха и свежей пищи» [7, с. XX]. Разам з тым, былі аўтары, якія крытыкавалі судовую рэформу 1864 г. і парэформеннае правасуддзе. Сярод іх выдзяляўся голас галоўнага рэдактара «Московских ведомостей» М. Н. Каткова, які ў 1880-я гг. актыўна выступаў супраць прынцыпаў незалежнасці, спаборнасці, галоснасці суда, інстытутаў выбарных міравых суддзяў і, асабліва, суда прысяжных [9, с. 140, 307, 331, 498].

Перыяд апошняй трэці XIX – пачатку XX ст. характарызаваўся бурным развіццём юрыдычнай навукі ў Расійскай імперыі. У гэты час выйшла значная колькасць прац на судова-прававую тэматыку – аб судзе прысяжных [10], адвакатуры [11], розных аспектах судаводства [12] і інш.

Як ужо адзначалася, з ліквідацыяй пры Мікалаі І у заходніх губернях мясцовых асаблівасцей у судова-прававой сферы спецыяльны інтарэс гісторыкаў і правазнаўцаў да праблем правасуддзя ў дадзеным рэгіёне значна знізіўся. Тым не менш тэма судовай сістэмы менавіта на тэрыторыі Беларусі ў другой палове XIX – пачатку XX ст. знайшла адлюстраванне ў публікацыях дарэвалюцыйнага перыяду. У выданні «Министерство юстиции за сто лет. 1802–1902. Исторический очерк» паказаны працэс падрыхтоўкі ўвядзення ў краі судовай рэформы 1864 г. [13, с. 114–116, 122–124]. Таксама дадзенай тэме прысвечана праца Н. М. Калмакова «Записка о Судебной реформе в Западном крае вообще и в частности в Киевской губернии» [14]. Асаблівая ўвага ў ёй надаецца матывам, якія вымусілі царскі ўрад урэшце ўвесці ў краі судовую рэформу. Уяўляе цікавасць праца В. А. Шэнінга «Очерк истории Витебского Окружного суда (1883–1893)» [15], у якой падрабязна апісваецца дзейнасць Віцебскага акруговага суда за перыяд з 1883 па 1892 г. Значную каштоўнасць у ёй прадстаўляюць абшырныя статыстычныя даныя аб асабовым складзе суда, руху ў ім спраў і інш.

***Гістарыяграфія савецкага перыяду.*** Гістарыяграфія дадзенага перыяду па тэме судовай сістэмы Расійскай імперыі ў 1772–1917 гг., у тым ліку на тэрыторыі Беларусі, прадстаўлена працамі савецкіх гісторыкаў. Яны грунтаваліся на прынцыпах марксісцка-ленінскай метадалогіі, у першую чаргу класавага падыходу. У адпаведнасці з ім суды з'яўляліся часткай надбудовы, якая абараняе інтарэсы пануючага класа і служыць захаванню існуючых вытворчых адносін. Адпаведна, у антаганістычных феадальным і буржуазным грамадствах правасуддзе вызначалася як інструмент прыгнёту працоўных мас. Аднак, нягледзячы на відавочны ідэалагічны і метада-

лагічны дагматызм, савецкая гістарыяграфія істотна павысіла ўзровень навуковай даследаванасці вывучаемай тэмы ў параўнанні з дарэвалюцыйны перыядам. Перш за ўсё гэта дасягнута дзякуючы ўвядзенню ў навуковы ўжытак значнага архіўнага матэрыялу.

Дарэформенная судовая сістэма разглядалася ў кантэксце агульнага наратыву крызісу феадальна-прыгонніцкай сістэмы і ацэньвалася як непрыдатная да належнага выканання функцый правасуддзя. Судовая рэформа 1864 г. у савецкай гістарыяграфіі паказвалася як вымушаная мера самадзяржаўя на фоне складвання рэвалюцыйнай сітуацыі і элемент прыстасавання палітычнай надбудовы да змененага ў выніку адмены прыгоннага права сацыяльна-эканамічнага базісу. Што датычыць характарыстыкі ў савецкай гістарыяграфіі самога зместу судовай рэформы, а таксама практычнага функцыянавання парэформеннай судовай сістэмы, то разам з прызнаннем яе пераваг над дарэформеннай падкрэсліваліся такія элементы, як саслоўнасць [16, с. 112], умяшальніцтва адміністрацыі ў судовую сферу, асобае судаводства па палітычных справах і г. д. [16, с. 107; 17, с. 100–101].

Беларускія савецкія навукоўцы, якія вывучалі судовую сістэму на тэрыторыі Беларусі, прытрымліваліся прыведзеных вышэй агульных метадалагічных падыходаў савецкай гістарыяграфіі. Разам з тым, тэматыка судовай сістэмы разглядалася ў кантэксце наогул палітыкі самадзяржаўя ў адносінах да дадзенай тэрыторыі, якая ў цэлым трактавалася як рэакцыйная.

Праблему трансфармацыі судовай сістэмы ў краі ў сувязі з падзеламі Рэчы Паспалітай і ўключэннем яго тэрыторыі ў склад Расійскай імперыі разгледзеў У. І. Пічэта ў працы «Восточная Белоруссия под властью царизма (1772–1796)» [18]. Дазвол выкарыстання ў судах польскай мовы і захаванне мясцовага феадальнага права аўтарам трактаваліся як часовая мера і тактычны манеўр самадзяржаўя, якое чакала моманту, калі з'явіцца зручная магчымасць поўнай уніфікацыі судова-прававога ладу краю з агульнаімперскім [18, с. 25].

У кантэксце рэакцыйнай палітыкі імперскага цэнтру да заходніх губерняў у савецкай гістарыяграфіі падавалася ўвядзенне ў краі пры Мікалаі І агульнарасійскай судовай сістэмы, якая характарызавалася выключна негатыўна (падпарадкаванасць адміністрацыйнай уладзе, саслоўнасць, бюракратызм, валакіта, хабарніцтва і г. д.) [19, с. 506; 20, с. 186–187].

Спецыяльна тэме судовых органаў на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. прысвечаны артыкул Е. Л. Бравер [21]. Праца адметна тым, што акрамя ўласна апісання судаўладкавання і судаводства ў краі, паказу эвалюцыі заканадаўства ў гэтай сферы на працягу адзначанага перыяду ў ёй прааналізаваны крыніцы па дадзенай праблеме, якія адкладаліся ў Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве БССР у г. Мінску (сёння – Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі).

Правядзенню судовай рэформы 1864 г. у Беларусі прысвечаны працы Ф. Р. Бялевіча [22] і В. А. Марыскіна [23]. Таксама гэтай праблеме ўдзелена значная ўвага ў манаграфіі С. М. Самбук «Политика царизма в Белоруссии во 2-й половине XIX века» [24, с. 84–87]. У згаданых працах асветлены падрыхтоўка правядзення рэформы, яе абмежаваны характар у краі, меры самадзяржаўя па нядопуску на судовыя пасады каталікоў, якія лічыліся палітычна нядобранадзейнымі.

Як бачым, для савецкай гістарыяграфіі, у параўнанні з дарэвалюцыйнай, характэрна адносна невялікая колькасць прац, прысвечаных развіццю асобных юрыдычных інстытутаў (суда прысяжных, адвакатуры, пракуратуры, натарыяту і інш.) ці судовых органаў (магістратаў, міравых судоў і г. д.). Гэта абумоўлена тым, што такія тэмы не ўяўляліся актуальнымі з пункту гледжання магчымасці выкарыстання гістарычнага вопыту для ўдасканалення савецкай судовай сістэмы ці паказу прагрэсіўнасці сацыялістычнага ладу ў параўнанні з буржуазным.

***Гістарыяграфія постсавецкага перыяду.*** Распад СССР і стварэнне асобных нацыянальных гістарыяграфій былых савецкіх рэспублік, у тым ліку беларускай, азначалі пераход на прынцыпова новы этап развіцця гістарычнай навукі на постсавецкай прасторы. У прыватнасці, гэта датычыла вывучэння судовай сістэмы Расійскай імперыі і асобных яе рэгіёнаў у канцы XVIII – пачатку XX ст. Пераход да метадалагічнага плюралізму выклікаў шэраг тэндэнцый у гістарыяграфіі. Савецкая гістарыяграфічная традыцыя фармацыйнага падыходу і эканамічнага дэтэрмінізму, хаця і была працягнута, але ўжо без выкарыстання пастулату аб класавай барацьбе. У постсавецкі перыяд адбываецца асваенне і выкарыстанне многімі гісторыкамі канцэпцый і падыходаў заходняй гістарыяграфіі (новай сацыяльнай гісторыі, мадэрнізацыйнай тэорыі, мікрагісторыі). Актуальнасць даследавання судовай сістэмы канца XVIII – пачатку XX ст., у адрозненні ад прац савецкага перыяду, стала абгрунтоўвацца ў тым ліку і неабходнасцю выкарыстання гістарычнага вопыту для ўдасканалення сучаснага судова-прававога ладу. Таму постсавецкія даследаванні выразна адрозніваюцца ад прац савецкіх навукоўцаў тым, што акцэнт змешчаны з паказу правасуддзя як рэпрэсіўнага інструменту самадзяржаўя ў класавай барацьбе на больш глыбокае вывучэнне самога механізму функцыянавання судовай сістэмы. Разам з тым, ва ўмовах адсутнасці дыктату «зверху» ў плане выбару метадалагічных падыходаў і ацэнак гістарычных працэсаў, у гістарыяграфіі, у параўнанні з савецкім перыядам, назіраецца пэўны крэн у наратыўную апісальную гісторыю.

Разгледзім навейшую (пачынаючы з 1991 г.) айчынную гістарыяграфію судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1917 гг. Адзіным на сённяшні дзень спецыяльным вучэбным дапаможнікам па вывучаемай тэме з'яўляецца «Судебные органы в Беларуси: конец XVIII – первая

половина XIX веков» В. А. Шаўкапляс [25]. Захаванне ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. у краі судаўладкавання ўзору часоў Рэчы Паспалітай аўтар тлумачыла тым, што тут працягвалі панаваць феадальны спосаб вытворчасці і феадальныя адносіны [25, с. 7]. Таксама адзначаецца, што змяненні ў мясцовым праве і сістэме правасуддзя, якія ўносіліся расійскімі ўладамі ў гэты перыяд, былі накіраваны на пэўную, але пакуль яшчэ не суцэльную ўніфікацыю іх з унутрырасійскімі парадкамі, а таксама ўмацаванне кантролю над судамі [25, с. 8–9, 11, 13, 19, 23–26, 30–31, 33–35, 45, 47].

Судовай сістэме на тэрыторыі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. прысвечаны артыкулы І. Г. Гушчынскага [26–28], А. П. Жытко і С. А. Талмачовай [29], С. Л. Лугаўцовай [30], Ю. Л. Коўшыка [31]. У іх разгледжаны праблемы судаўладкавання і судаводства, камплектавання кадравага складу судоў, палітыкі ўрада па ўніфікацыі мясцовага судова-прававога ладу з агульнаімперскім, падкрэслены саслоўны характар судовай сістэмы. У публікацыях І. Г. Гушчынскага [32] і А. А. Загорнава [33] раскрываюцца пытанні падрыхтоўкі і правядзення ў Беларусі судовай рэформы 1864 г., дзейнасці парэформенных судовых устаноў і іх ролі ў капіталістычнай мадэрнізацыі краю.

Тэма судовай сістэмы закранута ў даследаваннях сістэмы органаў дзяржаўнай улады на тэрыторыі Беларусі і іх кадравага складу. Напрыклад, у манаграфіі А. А. Кісялёва «Система управления и чиновничество белорусских губерний в конце XVIII – первой половине XIX в.» [34] паказана эвалюцыя судовай сістэмы краю і асаблівасці кадравай палітыкі ўрада ў перыяды праўлення Паўла І, Аляксандра І і Мікалая І. Адметна тое, што А. А. Кісялёў, у адрозненне ад большасці іншых даследчыкаў, даў у цэлым пазітыўную ацэнку пераўтварэнням імперскіх улад, накіраваных на ўкараненне агульнаімперскага заканадаўства ў сферы суда і парадку фарміравання асабовага складу судовых устаноў [34, с. 76].

Праблематыка судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1917 гг. знайшла адлюстраванне ў даследаваннях наогул палітыкі Расійскай імперыі ў краі. Я. К. Анішчанка, раскрываючы палітыку Кацярыны ІІ, адзначаў, што царызм з першых дзён далучэння беларускіх зямель замацаваў тут верхавенства рускіх законаў, паставіў суды ў залежнае становішча ад адміністрацыі, а дэклараванае захоўванне мясцовых правоў і судаводства аказалася фікцыяй [35, с. 87, 184, 186]. Значная ўвага праблеме ўвядзення на тэрыторыі Беларусі судовай рэформы 1864 г. удзяляецца і ў манаграфіі А. Ф. Свіб «Государственно-правовой статус Беларуси в составе России в пореформенный период (1861–1900)» [36]. Аўтар раскрывае эканамічныя матывы ўвядзення царскім урадам судовай рэформы ў краі [36, с. 80–82], а таксама ўказвае на адмоўны ўплыў абмежаванага тут характару буржуазных рэформ (у тым ліку і судовай) на фарміраванне беларускай нацыі [36, с. 91].

У сучаснай расійскай гістарыяграфіі неабходна вылучыць працы Е. А. Скрыпілёва [37], Н. М. Яфрэмавай [38], М. Г. Кароткіх [39], М. В. Нямыцінай [40] і інш. Найбольш папулярнай сярод расійскіх навукоўцаў тэмай, звязанай развіццём правасуддзя разглядаемага перыяду, з'яўляецца судовая рэформа 1864 г. Гэта звязана з тым, што яе прынцыпы (незалежнасць судовай улады, спаборнасць, галоснасць) з'яўляюцца ў наш час агульнапрызнанымі каштоўнасцямі. Акрамя таго, сучасная расійская судовая сістэма, як і дарэформенная, прадугледжвае інстытут міравога суда і суда прысяжных. Таму дадзеная праблематыка з'яўляецца надзвычай актуальнай і запатрабаванай. Ёй прысвечана не адна тысяча публікацый, абсалютная большасць з якіх пры гэтым носіць юрыдычна-тэарэтычны характар і фактычна абмяжоўваецца аналізам зместу заканадаўчых актаў.

Праблематыцы развіцця судовай сістэмы ў канцы XVIII – пачатку XX ст. прысвечаны шэраг даследаванняў украінскіх навукоўцаў (А. У. Шаўчук [41], В. С. Шандра [42] і інш.). Натуральна, у фокусе ўвагі ўкраінскай гістарыяграфіі знаходзіліся пытанні правасуддзя на тэрыторыі Украіны. Аднак дадзены матэрыял уяўляе інтарэс і ў кантэксце вывучэння судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі. Беларускія і ўкраінскія землі, якія былі ўключаны ў склад Расіі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай, мелі падабенства ў спецыфіцы працэсаў у судова-прававой сферы: захаванне да 1840 г. судовых устаноў і прававых норм часоў ВКЛ і Рэчы Паспалітай у грамадзянскім судаводстве, асаблівасці рэалізацыі судовай рэформы 1864 г. і інш.

***Замежная гістарыяграфія.*** Вывучэнне судовай сістэмы Расійскай імперыі канца XVIII – пачатку XX ст. адбывалася таксама ў замежнай гістарыяграфіі. Пры гэтым некаторыя працы спецыяльна прысвечаны вырашэнню задач, звязаных з праблемамі судаводства і судаўладкавання ў заходніх губернях.

У 1907 г. была апублікавана праца фінскага гісторыка У. Л. Лехтанена Die polnischen Provinzen Russlands unter Katharina II. In den Jahren 1772–1782 (*«Польскія правінцыі Расіі пры Кацярыне ІІ. У 1772–1782 гг.». –* ***І. Г.***) [43]. У ёй даволі падрабязна паказана сістэма судовых органаў і эвалюцыя судовага заканадаўства на тэрыторыі, далучанай да Расійскай імперыі ў выніку першага падзелу Рэчы Паспалітай [43, с. 278–295]. Дадзенае даследаванне, нягледзячы на непасрэдную прывязку яго тэмы да тэрыторыі Беларусі, значны аб'ём і, адпаведна, падрабязнасць раскрыцця разглядаемай праблематыкі, засталося дагэтуль практычна не запатрабаваным беларускімі гісторыкамі.

У міжваенны перыяд распрацоўкай праблем, звязаных судаўладкаваннем і судаводствам на тэрыторыі Беларусі пасля яе далучэння да расійскай імперыі, займаліся польскія даследчыкі С. Кутшэба [44, с. 208–214] і Л. Жытковіч [45, с. 104–113, 173–185].

Працы заходнееўрапейскіх і паўночнаамерыканскіх аўтараў грунтаваліся ў асноўным на апублікаваных крыніцах і практычна не выкарыстоўвалі архіўныя дакументы. Аднак, з іншага боку, яны не былі абмежаваны ідэалагічнымі і метадалагічнымі рамкамі, таму замежная гістарыяграфія, у параўнанні з савецкай, характарызуецца большым плюралізмам падыходаў, трактовак і ацэнак. Напрыклад, ад канцэптуальнага падыходу савецкіх гісторыкаў да вывучэння эвалюцыі правасуддзя ў Расійскай імперыі ў канцы XVIII – пачатку XX ст. адрозніваецца погляд амерыканскага гісторыка Рычарда Уортмана [46]. У якасці ключавой перадумовы судовай рэформы 1864 г. ён паказаў фарміраванне ў Расіі ў другой трэці XIX ст. шырокага класа чыноўнікаў з юрыдычнай адукацыяй, для правасвядомасці якіх былі ўласцівыя каштоўнасці самастойнасці суда ад адміністрацыйнай улады, яго кампетэнтнасці і сумленнасці.

Таксама варта згадаць манаграфію амерыканскага даследчыка Э. Тадэна Russia's Western Borderlands, 1710–1870 («*Заходняе памежжа Расіі, 1710–1870*». – ***І. Г.***) [47], у якой у якасці важнага элемента расійскай палітыкі ў краі ў канцы XVIII – першай трэці XIX ст. паказваецца захаванне ў дзеянні Статута ВКЛ 1588 г. Э. Тадэн. На думку аўтара, увядзенне ў краі агульнарасійскай судовай сістэмы адбылося толькі тады, калі расійская юрыдычная навука і адукацыя дасягнулі пэўнага ўзроўню развіцця, што зрабіла магчымым навязаць расійскія прававыя нормы і суды «былым польскім правінцыям» [47, с. 44, 54].

У 1990–2000-я гг. заходнееўрапейскіх і паўночнаамерыканскіх навукоўцаў, якія займаліся вывучэннем развіцця правасуддзя ў Расійскай імперыі, найбольш цікавіла праблема імплементацыі ліберальных прынцыпаў судаводства і судаўладкавання ў прававую сістэму і палітычны лад самадзяржаўнай Расіі (П. Соламон [48], Ё. Бабероўскі [49] і інш.).

Асобна неабходна вылучыць манаграфію польскага даследчыка С. Годэка III Statut Litewski w dobie porozbiorowej («*III Статут літоўскі ў эпоху пасля падзелаў*» – ***І. Г.***) [50]. У ёй падрабязна прааналізавана выкарыстанне III Статута ВКЛ у судовай практыцы на тэрыторыі, далучанай да Расіі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай. У прыватнасці, прымяненне асобных артыкулаў статута на практыцы, прыстасаванне ў канкрэтных сітуацыях нормаў мясцовага права да дзеючага расійскага заканадаўства і інш.

*Заключэнне.* Гістарыяграфічны аналіз дазваляе зрабіць выснову аб тым, што тэме судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі ў 1772–1917 гг. хаця і прысвечана даволі вялікая колькасць публікацый, аднак у асноўным яны прадстаўлены артыкуламі ў часопісах ці зборніках. Спецыяльныя манаграфічныя ці калектыўныя выданні па дадзенай тэме адсутнічаюць. У найбольшай ступені, на падставе галоўным чынам заканадаўчых актаў, раскрыта судаўладкаванне і яго эвалюцыя на працягу разглядаемага перыяду, вызначана нарматыўна-прававая база судаводства, паказаны асаблівасці ўрадавай палітыкі адносна судова-прававой сферы краю на розных этапах. Найменш даследаванымі аспектамі вывучаемай тэмы бачацца наступныя праблемы: абгрунтаванне абумоўленасці эвалюцыі судовай сістэмы патрэбамі грамадскага развіцця; раскрыццё ўзаемадачыненняў органаў суда і адміністрацыйнай улады; выяўленне ролі правасуддзя ў развіцці фінансава-эканамічнай сферы і рэгуляванні сацыяльных стасункаў; вызначэнне эфектыўнасці судовых устаноў па забеспячэнні законнасці і правапарадку ў грамадстве.

*Літаратура*


1. Ручной словарь, или краткое содержание польских и литовских законов. – СПб. : Сенат. тип., 1810. – XV, [1], 382, [4] с.
2. *Korowicki, A.* Porządek sądowy kryminalny podług praw rossyyskich ułożony / A. Korowicki. – Wilno : Józef Zawadzki, 1831. – 135 s.
3. *Korowicki, A.* Proces cywilny litewski / A. Korowicki. – Wilno : Józef Zawadzki, 1826. – 316 s.
4. *Жукович, П. Н.* Управление и суд в Западной России в царствование Екатерины II / П. Н. Жукович // Журн. М-ва народ. просвещения. Нов. сер. – 1914. – № 3. – С. 88–120.
5. *Жукович, П. Н.* Западная Россия в царствование императора Павла / П. Н. Жукович // Журн. М-ва народ. просвещ. Нов. серия. – Ч. 63. – 1916. – № 6. – С. 183–226.
6. *Нольде, Б. Э.* Очерки русского государственного права / Б. Э. Нольде. – СПб. : Тип. «Правда», 1911. – 554 с.
7. *Джаншиев, Г.* Эпоха великих реформ. Исторические справки / Г. Джаншиев. – М. : Типо-литография т-ва И. Н. Кушнеров и Ко, 1900. – 820, [9] с.
8. *Кони, А. Ф.* Отцы и дети судебной реформы / А. Ф. Кони. – М. : Изд. т-ва И. Д. Сытина, 1914. – [4], IV, [4], 296, 22 с.


*References*


1. Ruchnoj slovar', ili kratkoe soderzhanie pol'skih i litovskih zakonov. – SPb. : Senat. tip., 1810. – XV, [1], 382, [4] s.
2. *Korowicki, A.* Porządek sądowy kryminalny podług praw rossyyskich ułożony / A. Korowicki. – Wilno : Józef Zawadzki, 1831. – 135 s.
3. *Korowicki, A.* Proces cywilny litewski / A. Korowicki. – Wilno : Józef Zawadzki, 1826. – 316 s.
4. *Zhukovich, P. N.* Upravlenie i sud v Zapadnoj Rossii v carstvovanie Ekateriny II / P. N. Zhukovich // Zhurn. M-va narod. prosveshcheniya. Nov. ser. – 1914. – № 3. – S. 88–120.
5. *Zhukovich, P. N.* Zapadnaya Rossiya v carstvovanie imperatora Pavla / P. N. Zhukovich // Zhurn. M-va narod. prosveshch. Nov. seriya. – Ch. 63. – 1916. – № 6. – S. 183–226.
6. *Nol'de, B. E.* Ocherki russkogo gosudarstvennogo prava / B. E. Nol'de. – SPb. : Tip. «Pravda», 1911. – 554 s.
7. *Dzhanshiev, G.* Epoha velikih reform. Istoricheskie spravki / G. Dzhanshiev. – M. : Tipo-litografiya t-va I. N. Kushnerov i Ko, 1900. – 820, [9] s.
8. *Koni, A. F.* Otcy i deti sudebnoj reformy / A. F. Koni. – M. : Izd. t-va I. D. Sytina, 1914. – [4], IV, [4], 296, 22 s.

9. *Катков, М.* Собрание передовых статей Московских ведомостей. 1886 год / М. Катков. – М. : Тип. В. В. Чичерина, 1898. – 691 с.
10. *Бобрищев-Пушкин, А. М.* Эмпирические законы деятельности русского суда присяжных (с атласом) / А. М. Бобрищев-Пушкин. – М. : Печатня А. И. Снегиревой, 1896. – [4], 616, IV с.
11. *Арсеньв, К. К.* Заметки о русской адвокатуре / К. К. Арсеньв. – СПб. : Тип. В. Демакова, 1875. – 206 с.
12. *Есипов, В. В.* Очерк русского уголовного права. Часть общая / В. В. Есипов. – Варшава : Тип. Варшав. учеб. окр., 1894. – [8], 419, [1] с.
13. Министерство юстиции за сто лет. 1802–1902. Исторический очерк. – СПб. : Сенат. тип., 1902. – 340 с.
14. *Колмаков, Н. М.* Записка о Судебной реформе в Западном крае вообще и в частности в Киевской губернии / Н. М. Колмаков. – Киев : Тип. М. П. Фрица, 1872. – 33 с.
15. *Шенинг, В.* А. Очерк истории Витебского Окружного суда (1883–1893) / В. А. Шенинг. – Витебск : Губ. тип., 1894. – 69 с.
16. *Покровский, М. Н.* Русская история с древнейших времен : в 4 т. / М. Н. Покровский. – [М?] : Гос. социально-экономич. изд-во, 1934. – Т. 4. – 448 с.
17. История СССР с древнейших времен до наших дней : в 12 т. / под ред. В. Н. Пономарева [и др.]. – М. : Наука, 1968. – Т. 5. – 731 с.
18. *Пичета, В. И.* Восточная Белоруссия под властью царизма (1772–1796) / В. И. Пичета // Ученые записки. Вып. 93. Кн. 1: История. – М. : МГУ, 1946. – С. 20–42.
19. *Юшков, С. В.* История государства и права СССР : в 2 ч. : учеб. для юрид. ин-тов и фак. / С. В. Юшков. – Ч. 1. – М. : Госюриздат, 1961. – 533 с.
20. *Ерошкин, Н. П.* История государственных учреждений дореволюционной России / Н. П. Ерошкин. – М. : Высш. школа, 1983. – 352 с.
21. *Бравер, Е. Л.* К вопросу об истории судебных учреждений Белоруссии конца XVIII – первой половины XIX в. / Е. Л. Бравер // Вопросы архивоведения и источниковедения в БССР : материалы науч. конф. / редкол. : В. Н. Жигалов (отв. ред.) [и др.]. – Минск : Выш. школа, 1971. – С. 458–470.
22. *Белевич, Ф. Р.* Проведение судебной реформы 1864 года в Белоруссии / Ф. Р. Белевич // Вопросы общенародного государства и права Белорусской ССР / под общ. ред. Т. С. Горбунова. – Минск : Акад. наук Белорус. ССР, 1963. – С. 40–56.
23. *Марыскин, А. В.* Судебная реформа 1864 года и особенности ее проведения на территории Белоруссии : автореф. … дис. канд. юрид. наук : 12.00.01 / А. В. Марыскин. – М. : Всесоюз. заоч. юрид. ин-т, 1985. – 24 с.
24. *Самбук, С. М.* Политика царизма в Белоруссии во 2-й половине XIX века / С. М. Самбук. – Минск : Наука и техника, 1980. – 224 с.
25. *Шелкопляс, В. А.* Судебные органы в Беларуси: конец XVIII – первая половина XIX веков : учеб. пособ. / В. А. Шелкопляс. – Минск : Акад. МВД РБ, 1997. – 64 с.
26. *Гушчынскі, І. Г.* Трансфармацыя судовай сістэмы на тэрыторыі Беларусі (1772–1796) / І. Г. Гушчынскі // Журн. Белорус. гос. ун-та. История. – 2019. – № 1. – С. 34–45.
27. *Гушчынскі, І. Г.* Судовая сістэма на тэрыторыі Беларусі ў 1797–1840 гг. / І. Г. Гушчынскі // Журнал Белорусского государственного университета. История. – 2020. – № 2. – С. 19–30.
28. *Гушчынскі, І. Г.* Судовая сістэма на тэрыторыі Беларусі ў 1840–1872 гг. / І. Г. Гушчынскі // Вестник Полоцкого государственного университета. Сер. А. – 2021. – № 1. – С. 68–73.

9. *Katkov, M.* Sobranie peredovyh statej Moskovskih vedomostej. 1886 god / M. Katkov. – M. : Tip. V. V. Chicherina, 1898. – 691 s.
10. *Bobrishchev-Pushkin, A. M.* Empiricheskie zakony deyatel'nosti russkogo suda prisyazhnyh (s atlasom) / A. M. Bobrishchev-Pushkin. – M. : Pechatnya A. I. Snegirevoj, 1896. – [4], 616, IV s.
11. *Arsen'v, K. K.* Zametki o russkoj advokature / K. K. Arsen'v. – SPb. : Tip. V. Demakova, 1875. – 206 s.
12. *Esipov, V. V.* Ocherk russkogo ugolovnogo prava. Chast' obshchaya / V. V. Esipov. – Varshava : Tip. Varshav. ucheb. okr., 1894. – [8], 419, [1] s.
13. Ministerstvo yusticii za sto let. 1802–1902. Istoricheskij ocherk. – SPb. : Senat. tip., 1902. – 340 s.
14. *Kolmakov, N. M.* Zapiska o Sudebnoj reforme v Zapadnom krae voobshche i v chastnosti v Kievskoj gubernii / N. M. Kolmakov. – Kiev : Tip. M. P. Frica, 1872. – 33 s.
15. *Shening, V. A.* Ocherk istorii Vitebskogo Okruzhnogo suda (1883–1893) / V. A. Shening. – Vitebsk : Gub. tip., 1894. – 69 s.
16. Pokrovskij, M. N. Russkaya istoriya s drevnejshih vremen : v 4 t. / M. N. Pokrovskij. – [M?] : Gos. social'no-ekonomich. izd-vo, 1934. – T. 4. – 448 s.
17. Istoriya SSSR s drevnejshih vremen do nashih dnej : v 12 t. / pod red. V. N. Ponomareva [i dr.]. – M. : Nauka, 1968. – T. 5. – 731 s.
18. *Picheta, V. I.* Vostochnaya Belorussiya pod vlast'yu carizma (1772–1796) / V. I. Picheta // Uchenye zapiski. Vyp. 93. Kn. 1: Istoriya. – M. : MGU, 1946. – S. 20–42.
19. *Yushkov, S. V.* Istoriya gosudarstva i prava SSSR : v 2 ch. : ucheb. dlya yurid. in-tov i fak. / S. V. Yushkov. – Ch. 1. – M. : Gosyurizdat, 1961. – 533 s.
20. *Eroshkin, N. P.* Istoriya gosudarstvennyh uchrezhdenij dorevolyucionnoj Rossii / N. P. Eroshkin. – M. : Vyssh. shkola, 1983. – 352 s.
21. *Braver, E. L.* K voprosu ob istorii sudebnyh uchrezhdenij Belorussii konca XVIII – pervoj poloviny XIX v. / E. L. Braver // Voprosy arhivovedeniya i istochnikovedeniya v BSSR : materialy nauch. konf. / redkol. : V. N. Zhigalov (otv. red.) [i dr.]. – Minsk : Vysh. shkola, 1971. – S. 458–470.
22. *Belevich, F. R.* Provedenie sudebnoj reformy 1864 goda v Belorussii / F. R. Belevich // Voprosy obshchenarodnogo gosudarstva i prava Belorusskoj SSR / pod obshch. red. T. S. Gorbunova. – Minsk : Akad. nauk Belorus. SSR, 1963. – S. 40–56.
23. *Maryskin, A. V.* Sudebnaya reforma 1864 goda i osobennosti ee provedeniya na territorii Belorussii : avtoref. … dis. kand. yurid. nauk : 12.00.01 / A. V. Maryskin. – M. : Vsesoyuz. zaoch. yurid. in-t, 1985. – 24 s.
24. *Sambuk, S. M.* Politika carizma v Belorussii vo 2-j polovine XIX veka / S. M. Sambuk. – Minsk : Nauka i tekhnika, 1980. – 224 s.
25. *Shelkoplyas, V. A.* Sudebnye organy v Belarusi: konec XVIII – pervaya polovina XIX vekov : ucheb. posob. / V. A. Shelkoplyas. – Minsk : Akad. MVD RB, 1997. – 64 s.
26. *Gushchynski, I. G.* Transfarmacyya sudovaj sistemy na terytoryi Belarusi (1772–1796) / I. G. Gushchynski // Zhurn. Belorus. gos. un-ta. Istoriya. – 2019. – № 1. – S. 34–45.
27. *Gushchynski, I. G.* Sudovaya sistema na terytoryi Belarusi ŭ 1797–1840 gg. / I. G. Gushchynski // Zhurnal Belorusskogo gosudarstvennogo universiteta. Istoriya. – 2020. – № 2. – S. 19–30.
28. *Gushchynski, I. G.* Sudovaya sistema na terytoryi Belarusi ŭ 1840–1872 gg. / I. G. Gushchynski // Vestnik Polockogo gosudarstvennogo universiteta. Ser. A. – 2021. – № 1. – S. 68–73.

29. *Жытко, А. П.* Судовая сістэма на тэрыторыі Беларусі (канец XVIII – сярэдзіна XIX ст.) / А. П. Жытко, С. А. Талмачова // Весці БДПУ. Сер. 2. – 2014. – № 2. – С. 20–25.
30. *Луговцова, С. Л.* Реформирование системы судебных учреждений Беларуси в последней трети XVIII в. / С. Л. Луговцова // Працы гістарычнага факультэта БДУ. Вып. 4 : навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2009. – С. 289–295.
31. *Ковшик, Ю. Л.* Комплектование судебно-административных учреждений выборными от дворянства чиновниками на территории Беларуси в 1775–1796 гг. / Ю. Л. Ковшик // Весці БДПУ. Сер. 2. – 2022. – № 4. – С. 75–82.
32. *Гушчынскі, І. Г.* Роля судовых устаноў у палітычным жыцці і сацыяльна-эканамічным развіцці Беларусі (1864 – 1914 гг.) : дыс. ... канд. гіст. навук : 07.00.02 / І. Г. Гушчынскі. – Мінск : БДПУ, 2011. – 170 л.
33. *Загорнов, А. А.* Судебная реформа 1864 г. и капиталистическая модернизация Российской империи / А. А. Загорнов // Працы гістарычнага факультэта БДУ. Вып. 4 : навук. зб. / рэдкал.: У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : БДУ, 2009. – С. 235–241.
34. *Киселев, А. А.* Система управления и чиновничество белорусских губерний в конце XVIII – первой половине XIX в. : монография / А. А. Киселев. – Минск : Воен. акад. РБ, 2007. – 171 с.
35. *Анішчанка, Я. К.* Беларусь у часы Кацярыны II (1772–1796 гады) / Я. К. Анішчанка. – Мінск : ЗАТ «Веды», 1998. – 211 с.
36. *Свиб, А. Ф.* Государственно-правовой статус Белоруссии в составе России в пореформенный период (1861–1900) : монография / А. Ф. Свиб. – Минск : Белорус. ин-т правоведения, 2004. – 120 с.
37. *Скрипилев, Е. А.* Развитие русского права во второй половине XIX – начале XX века / Е. А. Скрипилев. – М. : Наука, 1997. – 368 с.
38. *Ефремова, Н. Н.* Судоустройство России в XVIII – первой половине XIX в. (историко-правовое исследование) / Н. Н. Ефремова. – М. : Наука, 1993. – 192 с.
39. *Коротких, М. Г.* Судебная реформа 1864 года в России (сущность и социально-правовой механизм формирования) / М. Г. Коротких. – Воронеж : Изд-во Воронеж. ун-та, 1994. – 238, [2] с.
40. *Немытина, М. В.* Суд в России : вторая половина XIX – начало XX вв. : автореф. дис. ... д-ра юрид. наук : 12.00.01 / М. В. Немытина. – М. : Акад. упр. МВД России, 1999. – 40 с.
41. *Шевчук, А. В.* Судова влада в житті суспільства Правобережної України (кінець XVIII – перша третина XIX ст.) / А. В. Шевчук. – Житомир : Видавець Євенок О. О., 2022. – 580 с.
42. *Шандра, В.* Совісні суди в Україні (остання чверть XVIII – середина XIX ст.) / В. Шандра. – Київ : Інститут історії України, 2011. – 266 с.
43. *Lehtonen, U. L.* Die polnischen Provinzen Russlands unter Katharina II. In den Jahren 1772–1782 / U. L. Lehtonen. – Berlin : G. Reimer, 1907. – 688 s.
44. *Kutrzeba, S.* Historya ustroju Polski w zarysie : w 4 t. / S. Kutrzeba. – T. 3 : Po rozbiorach. – Cz. 1. – Lwów : Księgarnia Polska Bernarda Połonieckiego, 1920. – 276 s.
45. *Żytkowicz, L.* Rządy Repnina na Litwie w latach 1794–7 / L. Żytkowicz. – Wilno : Towarzystwo Przyjaciów Nauk w Wilnie, 1938. – 464 s.

29. *Zhytko, A. P.* Sudovaya sistema na terytoryi Belarusi (kanec XVIII – syaredzina HIH st.) / A. P. Zhytko, S. A. Talmachova // Vesci BDPU. Ser. 2. – 2014. – № 2. – S. 20–25.
30. *Lugovcova, S. L.* Reformirovanie sistemy sudebnyh uchrezhdenij Belarusi v poslednej treti XVIII v. / S. L. Lugovcova // Pracy gistarychnaga fakul'teta BDU. Vyp. 4 : navuk. zb. / redkal.: U. K. Korshuk (adk. red.) [i insh.]. – Minsk : BDU, 2009. – S. 289–295.
31. *Kovshik, Yu. L.* Komplektovanie sudebno-administrativnyh uchrezhdenij vybornymi ot dvoryanstva chinovnikami na territorii Belarusi v 1775–1796 gg. / Yu. L. Kovshik // Vesci BDPU. Ser. 2. – 2022. – № 4. – S. 75–82.
32. *Gushchynski, I. G.* Rolya sudovyh ustanoŭ u palitychnym zhycci i sacyyal'na-ekanamichnym razvicci Belarusi (1864 – 1914 gg.) : dys. ... kand. gist. navuk : 07.00.02 / I. G. Gushchynski. – Minsk : BDPU, 2011. – 170 l.
33. *Zagornov, A. A.* Sudebnaya reforma 1864 g. i kapitalisticheskaya modernizaciya Rossijskoj imperii / A. A. Zagornov // Pracy gistarychnaga fakul'teta BDU. Vyp. 4 : navuk. zb. / redkal.: U. K. Korshuk (adk. red.) [i insh.]. – Minsk : BDU, 2009. – S. 235–241.
34. *Kiselev, A. A.* Sistema upravleniya i chinovnichestvo belorusskih gubernij v konce XVIII – pervoj polovine XIX v. : monografiya / A. A. Kiselev. – Minsk : Voen. akad. RB, 2007. – 171 s.
35. *Anishchanka, Ya. K.* Belarus' u chasy Kacyaryny II (1772–1796 gady) / Ya. K. Anishchanka. – Minsk : ZAT «Vedy», 1998. – 211 s.
36. *Svib, A. F.* Gosudarstvenno-pravovoj status Belorussii v sostave Rossii v poreformennyj period (1861–1900) : monografiya / A. F. Svib. – Minsk : Belorus. in-t pravovedeniya, 2004. – 120 s.
37. *Skripilev, E. A.* Razvitie russkogo prava vo vtoroj polovine XIX – nachale HH veka / E. A. Skripilev. – M. : Nauka, 1997. – 368 s.
38. *Efremova, N. N.* Sudoustrojstvo Rossii v XVIII – pervoj polovine XIX v. (istoriko-pravovoe issledovanie) / N. N. Efremova. – M. : Nauka, 1993. – 192 s.
39. *Korotkih, M. G.* Sudebnaya reforma 1864 goda v Rossii (sushchnost' i social'no-pravovoj mekhanizm formirovaniya) / M. G. Korotkih. – Voronezh : Izd-vo Voronezh. un-ta, 1994. – 238, [2] s.
40. *Nemytina, M. V.* Sud v Rossii : vtoraya polovina HIH – nachalo HH vv. : avtoref. dis. ... d-ra yurid. nauk : 12.00.01 / M. V. Nemytina. – M. : Akad. upr. MVD Rossii, 1999. – 40 s.
41. *Shevchuk, A. V.* Sudova vlada v zhitti suspil'stva Pravoberezhnoï Ukraïni (kinec' XVIII – persha tretina HIH st.) / A. V. Shevchuk. – Zhitomir : Vidavec' Єvenok O. O., 2022. – 580 s.
42. *Shandra, V.* Sovisni sudi v Ukraïni (ostannya chvert' HVIII – seredina XIX st.) / V. Shandra. – Kiïv : Institut istoriï Ukraïni, 2011. – 266 s.
43. *Lehtonen, U. L.* Die polnischen Provinzen Russlands unter Katharina II. In den Jahren 1772–1782 / U. L. Lehtonen. – Berlin : G. Reimer, 1907. – 688 s.
44. *Kutrzeba, S.* Historya ustroju Polski w zarysie : w 4 t. / S. Kutrzeba. – T. 3 : Po rozbiorach. – Cz. 1. – Lwów : Księgarnia Polska Bernarda Połonieckiego, 1920. – 276 s.
45. *Żytkowicz, L.* Rządy Repnina na Litwie w latach 1794–7 / L. Żytkowicz. – Wilno : Towarzystwo Przyjaciów Nauk w Wilnie, 1938. – 464 s.

46. *Wortman, R.* The Development of a Russian Legal Consciousness / R. Wortman. – Chicago ; London : University of Chicago Press, 1976. – 345 p.
47. *Thaden, E. C*. Russia's Western Borderlands, 1710–1870 / E. C. Thaden. – New Jersey : Princeton University Press, 1984. – 292 p.
48. *Solomon, P.* Courts and Their Reform in Russian History / P. H. Solomon // Reforming Justice in Russia, 1864–1996: Power, Culture, and the Limits of Legal Order. – New York–London : M.E. Sharpe, 1997. – P. 3–20.
49. *Baberowski, J.* Autokratie und Justiz: zum Verhältnis von Rechtsstaatlichkeit und Rückständigkeit im ausgehenden Zarenreich 1864–1914 / J. Baberowski. – Frankfurt am Main : V. Klostermann, 1996. – 845 s.
50. *Godek, S.* III Statut Litewski w dobie porozbiorowej / S. Godek. – Warszawa : Wydawnictwo Uniwersytetu Kardynała Stefana Wyszyńskiego, 2012. – 810 s.

46. *Wortman, R.* The Development of a Russian Legal Consciousness / R. Wortman. – Chicago ; London : University of Chicago Press, 1976. – 345 p.
47. *Thaden, E. C.* Russia's Western Borderlands, 1710–1870 / E. C. Thaden. – New Jersey : Princeton University Press, 1984. – 292 p.
48. *Solomon, P.* Courts and Their Reform in Russian History / P. H. Solomon // Reforming Justice in Russia, 1864–1996: Power, Culture, and the Limits of Legal Order. – New York–London : M.E. Sharpe, 1997. – P. 3–20.
49. *Baberowski, J.* Autokratie und Justiz: zum Verhältnis von Rechtsstaatlichkeit und Rückständigkeit im ausgehenden Zarenreich 1864–1914 / J. Baberowski. – Frankfurt am Main : V. Klostermann, 1996. – 845 s.
50. *Godek, S.* III Statut Litewski w dobie porozbiorowej / S. Godek. – Warszawa : Wydawnictwo Uniwersytetu Kardynała Stefana Wyszyńskiego, 2012. – 810 s.